ПРАЛЕТАРЫ УСЕХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

ГОДЗІЁННАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ. № 92 || Нядзеля, 26-га красавіка 1931 г. || № 92

КОШТ НУМАРУ 9 ГОРАДЗЕ І РАЁНАХ 5 кап.

РЭДАКЦЫЯ: Пешая вул., 3-ці паверх, пак. 39, 40, 41, 43. Тэлеф. агульны: 2-85, » рэдактара 1-73, » сэкрат. і к-ры . . . 72.

Подпісная цана ў месяц: Для рабочых, служачых і калгасьнікаў — р. 80 к. Для ўстаноў . . . 1 » — » З додаткам «Чырвоная Беларусь»: Для рабочых, служачых і калгасьнікаў 1 » — » Для ўстаноў . . . 1 » 20 »

Плата за абвесткі: За радок нэтэту . . . . . 30 кап. Для інтэрадрэсных . . . . . 40 » Пры шматразовым друкаваньні скідка ад 30 да 50 проц.

ГОД ВЫДАНЬНЯ 14-ты.

ЗАМАЦАВАНЬНЕМ НОВЫХ КАЛГАСАЎ,

неадкладным увядзеньнем зьдзельшчыны забясьпечым посьпех надыходзячай сяўбы

Усю ўвагу кантрактацыі яравых, на аснове якой разгортваецца масавы рух беднякоў і сераднякоў у калгасы

Аб чым вучаць факты Фёдараўкі

Захапіўшыся лічбамі, Шумнянскі сельсавет і брыгадзіры пускалі калгасы на волю хвалі

Раскіданая па хутарох вёска **Фёдараўка**, Шумнянскага сельсавету, налічвае 46 гаспадарак, з якіх толькі 6 бядняцкіх. Цьвёрдае заданьне было толькі дано двум гаспадаркам. У Фёдароўцы можна знайсьці былых прыставоў, царкоўных старастаў і іншых асоб з былымі «заслугамі». Да вёскі Фёдараўка шчыльна прылягаюць вёскі Сялюцкага і Замастоцкага сельсаветаў, кулаччо якіх нярэдка заглядвае ў Фёдараўку і там разгортвае сваю дзейнасьць.

Шумнянскі сельсавет на чале з былым старшынёй **Клеймовічам** ад патуранньня кулаку перайшоў да прамой спайкі з ім. Кулаччо вызваляліся ад падатку—не здавала цьвёрдыя заданьні, зрывала мерапрыемствы і на гэта спакойна сельсавет і парт'ячэйка пазіралі. Практыка сельсавету і яго кіраўніка Клеймовіча была яўна кулацкая. Яна зусім ня спрыяла разгортваньню калектывізацыі, душыла самадзейнасьць і ініцыятыву беднаты.

Маюцца ў Шумнянскім сельсавеце і 2 партыйныя ячэйкі, якія, як і сельсавет, у адносінах калектывізацыі нічога не рабілі, задачы вясновага севу праходзілі міма парт'ячэек. Яны з прымірэнцтвам адносіліся да кулацкіх дзеячоў, такіх як Клеймовіч і праяўлялі махровую правую практыку ў адносінах барацьбы з кулацтвам.

«Дзейнасьць» Шумнянскага сельсавету і партыйных ячэек, як нельга лепш падрыхтавала цьвёрды грунт для кулацкай агітацыі. Кулак шалёна атакаваў усе мерапрыемствы і ня дзіва, што да апошняга часу аніякага калгаснага прыліву ня было.

Зараз прыняты меры. Кіраўніцтва сельсавету і партыйнай ячэйкі адноўлена. Шырока ўзьнялася калгасная хваля. З 8-мі проц. калектывізаваных гаспадарак сельсавет дасягнуў 40, але тое, што адбылося зараз у вёсцы Фёдараўка, павінна прыкаваць увагу ўсёй партарганізацыі, калгасных бядняцка-сераднякіх мас сялянства і сельсаветаў.

Прысланым брыгадзірам пасьля некаторай працы ўдалося ў вёсцы Фёдараўка арганізаваць калгас з 21 гаспадаркі. Брыгадзіры палічылі, што яны сваю справу скончылі. Кулаччо даўно ўжо мела свой зуплыў на беднату і сераднякоў Фёдараўкі і зараз, у зьвязку з арганізацыяй калгасу, асабліва праявіла сваю спрытнасьць. Кулаччо пусьціла варожыя чуткі аб тым, што цьвёрдых заданьняў ужо нікому не даюць, што калгасы ўсюды развальваюцца, а ўступіўшыя ў калгас павінны зараз жа падаць агульную заяву аб выхадзе. «Трэба дзейнічаць усім разам». Кулацкай брахні папамаглопраў леньне калгасу, якое пры правядзеньні падліку маёмасьці і абагуленьні, пачало брацьвучок коз, сьвіней і нават курэй. Усё гэта прывяло да таго, што арганізаваны калгас у вёсцы Фёдараўка фактычна распаўся на радасьць кулацтва.

Кулацкай агітацыі сваячасова ня быў дан адпор. Мала таго, брыгадзіры і сельсавет, захапіўшыся сваімі посьпехамі лічбамі і процантамі, зусім ўпусьцілі з свайго зроку асноўнае **арганізацыйнае афармленьне і гаспадарчае замацаваньне зноў арганізаваных калгасаў**. Не замацаваўшы, як сьлед калгас у вёсцы Фёдараўка, брыгадзіры не паказваліся туды заставіўшы калгас без усялякага кіраўніцтва і гэтым самі дапамаглі яго развалу. Толькі дзякуючы сваечасова прынятым мерам—высылцы спэцыяльнай брыгады з Гаркому КП(б)Б удалося выправіць дапушчаныя памылкі. Беднота і сераднякі вёскі Фёдараўка пасьля дасканалага растлумачэньня шкоднасьці кулацкай хлусьні і зробленых імі памылак зноў вярнуліся ў калгас. Чатыры заможных гаспадаркі гэтай вёскі атрымалі цьвёрдае заданьне. Зараз зноў арганізаваны калгас з дапамогай брыгады прыступіў да практычнай працы.

Чаму вучыць нас факт, здарыўшыйся ў Фёдараўцы? Ён, як нельга лепш, пацьвярджае неабходнасьць ня толькі арганізацыі калгасу і на гэтым супакоіцца, але зрабіць галоўнае—замацаваць яго, чаго брыгада Шумнянскага сельсавету ня здолела зрабіць і дапамагла кулацкай агітацыі. Гэты факт яшчэ раз пацьвярджае неабходнасьць яшчэ больш бязьлітаснай узмацнёнай барацьбы з кулацтвам і яго падпявалам арганізацыі і шырокага разгортваньня працы з беднатой. Урокі Фёдараўкі павінны быць улічаны.

Брыгада «Віцебскага Пралетарыя»
Яз. Шульман, Г. Максімаў.

Калгас імя 2-й бальшавіцкай вясны

24-га красавіка адбыўся сход бедняко ў і сераднякоў вёскі Мішкуры, дзе распрацоўваўся закон аб ковым сельска-гаспадарчым падатку на 1931 г. і адозва III Усебеларускага зьезду калгасаў.

Пасьля прапрацоўкі 11 бедняноў і сераднякоў, на чале з членамі сельсавету, арганізавалі калгас імя другой бальшавіцкай вясны, тут-жа прапрацавалі і прынялі статут сельска-гаспадарчай арцелі

Абралі праўленьне і рэўкамісію. Арганізацыйны сход калгаснікаў пастанавіў уключыцца і ва-ударнае правядзеньне бальшавіцкага севу.

Зноў уступіўшыя калгасьнікі заклікаюць усіх бедняноў і сераднякоў пасьледваць іх прыкладу.

Брыгада—Гірштэн, Гарбатаў.

Лепшым адказам на кулацкія вылазкі будзе арганізацыя новых калгасаў

Яшчэ больш разгарнуць работу з беднатой

Дзякуючы разгарнуўшайся за апошні час працы і сваечасова дадзеным сыгналам газэтай «Віцебскі Пралетары», па Сіроцінскаму сельсавету маецца некаторы зрух у правядзеньні калектывізацыі і вясновага севу. За апошнюю пяцідзёнку арганізавана тры новых калгасы: у вёсцы **Карташы**—калгас **«Чырвоны Пахар»** з 8 гаспадарак, у **Масераве** калгас імя **Калініна**—з 6 гаспадарак і ў мястэчку **Сіроціна—Імя Урыцкага** з 9 гаспадарак.

Апрача таго, створаны ініцыятыўныя групы ў вёсцы **Екацерынгофе**, якая сабрала 9 заяў у калгас. Паступілі заявы ад сялян вёскі **Бандуры**, каб у іх арганізаваць арцель па першапачатковай апрацоўцы зямлі.

Гэты зрух зроблен дзякуючы ўзьняцьцю работы з беднатой. Кіраўніцтва сельсавету недастаткова праводзіла працу па выяўленьні кулацкіх гаспадарак. Зараз гэтае выпраўляецца. 12 гаспадарак абкладзены ў індывідуальным парадку, дадзены цьвёрдыя заданьні па пасеву 80 заможным гаспадаркам.

Кулаччо шалёна атакуе ўсе праводзімыя мерапрыемствы. Яно прыкладае ўсе свае здольнасьці, каб узяць пад свой уплыў бядняцка-сераднякія масы. У вёсках **Плігаўка і Жуява** кулакі і падкулачнікі некалькі разоў зрывалі сходы. У вёсцы **Падмішнеўе**, побач са сходам беднаты, які павінен быў адбыцца, сабраўся сход падкулачнікаў і заможнікаў, на чале з членам сельсавету **Рудавым**, дзе кулаччо абгаварвала як лепш сарваць арганізацыю калгасу. Кулаччо Сіроцінскага раёну, адчуваючы сваю пагібель, пачынае шалёна супраціўляцца — ад адкрытага наступу яно перайшло ў падполье. Беднота, пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі, павінна даць кулацкай агітацыі рашучы адпор. Лепшым адказам на кулацкую агітацыю будзе арганізацыя новых калгасаў, увядзеньне зьдзельшчыны ў іх, поўнае выкананьне пляну вясновага севу і кантрактацыі.

Брыгадзіры—**Барадулін, Карпман.**

Беднота і сераднякі вёсак Мішкова і Бабашкі пайшлі ў калгас

Мы, беднякі і сераднякі вёсак **Мішкава і Бабашкі Парфенаў І., Геўман А., Бабашкін Г., Каральноў Сямён, Ямяльянаў У., Каральноў К., Мацкевіч С., Каральноў І., Суеў У., Бабашка М., Бабашка Г., Каральноў К., Глушаненоў М., Мацкевіч У., Бабашка Фёдар, Каральноў Д., Арамацэвіч А., Сысоў Ц.**, заслухаўшы інфармацыю аб стварэньні сельска-гаспадарчай арцелі ў весках Мішкава і Бабашкі, Віцебскага сельсавету, пастанавілі арганізаваць, на падставе зачытанага статуту, сельска-гаспадарчую арцель, і просім калгассаюз хутчэй яе афармініць.

Упаўнаважаныя сходу: **Каральноў С., Парфенаў Н., Сысаў Ц.**

Тэмпы Болецкага сельсавету зрываюць кантрактацыю яравых

Праца па падрыхтоўцы да вясновага севу ў **Болецкім** сельсавеце праходзіць нездавальняюча. Амаль па ўсіх пунктах пасеўныя пляны да двара не даведзены. **Кантрактацыя яравых культур правальваецца.**

Маючы такое становішча, сельсавет павінен быў мабілізаваць усе свае сілы на ліквідацыю гэтага прарыву, але на справе далёка ня так. Прыехаўшай брыгадзе для дапамогі ў вясновым севе сельсавет не дапамагае. Партыйнае кіраўніцтва таксама адсутнічае.

4-га красавіка скліканўся сход сялян, дзе павінны былі прысутнічаць сакратар партыйнай ячэйкі Бычкоў і камсамольскай—Окуневуў, але яны палічылі за лепшае пайсьці ў лазьню. Партыйная ячэйка не перабудавала сваю працу тварам да калгасу і ў адносінах калектывізацыі праяўляе яўную апартуністычную недаацэнку.

Кантрактацыя яравых пасеваў зрываецца выключна з-за таго, што партыйная ячэйка і сельсавет не надалі належнай увагі гэтаму пытаньню. Гарадоцкі райком партыі за гэтыя зьявішчы павінен тэрмінова рэагаваць. Кіраўніцтва Болецкага сельсавету і партыйнай ячэйкі павінна быць адноўлена.

Свой.

Кантрактацыя тэхнічных падстае

Выгнаць з партячэйкі і сельсавету кулацкіх падпявал

Тэрмін кантрактацыі збожжавых культур скончыўся, але **Шумнянскі** сельсавет свае пляны ня выканаў, аб чым гавораць ніжэйпрыводзімыя факты:

На 18 красавіка плян па кантрактацыі аўсу выканан толькі на 50,3 проц., ячменю—60,8 проц. Яшчэ больш ганебныя паказальнікі дае кантрактацыя лёну і тэхнічных культур, якая выканана толькі на 43%, вікі на 58,4 проц., клеверу—25,6%, гароху—486,2 проц., бульбы—61,7%, гародніны—168,4 проц.

Як відаць, асабліва адстае кантрактацыя лёну, якая павінна заняць цэнтральнае месца ў выкананьні пляну.

Партыйная ячэйка кантрактацыі, як і іншымі гаспадарчымі пытаньнямі, не займалася. Аб яе правай практыцы ў друку ня раз адзначалася. Але вось зьдзіўляе, чаму канкрэтныя носьбіты зла, вінаватыя не прыцягнуты да адказнасьці. Сельсавет таксама невыстрачальна кіруе кантрактацыяй, ды і як кіраваць, калі і пасёньняшні дзень ў сельсавеце фактычна працуе кулацкі сьпявак **Клеймовіч**. Праводзімыя па пасеўкампаніі сходы не заўсёды ўвязваюцца з кантрактацыяй і такім чынам атрымліваецца разрыў паміж кантрактацыяй, пасеўкампаніяй і калектывізацыяй. Гэты недахоп неабходна тэрмінова ліквідаваць. Кулацкіх сьпевакоў з сельсавету і партыйнай ячэйкі трэба выгнаць. Работу з беднатой неабходна ўзьняць на належную вышыню.

З.

Зноў аб непарадках у каапгасе МОПР

Аб каапгасе **МОПР** газэта «Віцебскі Пралетары» ня раз пісала, але абураючыя факты бюракратызму, нядбайнасьці і галавацяпства працягваюць заставацца яшчэ і на сёньняшні дзень.

Выключна з-за нядбайнасьці адміністрацыі памарожана бульба ў склепе, згнаілі кармавыя буракі, жывёла корміцца без усялякага дагляду і нормы.

Працуе ў гаспадарцы жывёлавод **Здолькінаў**. Калі ў яго запытаюць, чаму ён усім цялятам дае аднолькавую норму кармоў, дык ён адказвае: «яны-ж усе з аднаго каапгасу». Дагляд за жывёлай вельмі нядбайны. Бываюць выпадкі, калі кароў і цялят доўгі час ня пояць, а жывёлавод на гэта не зварочвае ўвагі. Усё гэта выклікае захварэньне жывёлы.

Гэтыя брыдкасьці неабходна тэрмінова ліквідаваць. За нядбайныя адносіны жывёлавода трэба зьняць з працы.

Трушкін.

На такога «настаўніка» трэба зьвярнуць увагу

У вёсках **Рымары 1 і Рымары 2, Бараўлянскага** сельсавету, сяляне арганізавалі калгас.

У в. Рымары 1 жыве настаўнік **Багдановіч**, які мае сваю гаспадарку: 5—6 га зямлі, 1-го каня, 3-х кароў, дробную жывёлу і шмат калод пчэл.

Зразумеўшы, што яму, як «актывістаму»—настаўніку адмовіцца ад уступленьня ў калгас неяк няўдобна, ён распачаў разбазарваць сваю маёмасьць. Спачатку ён парашыў узяцца за жывёлу: стаў шукаць бедняка памяняць карову, з тым, каб вымяняць дрэнную, атрымаць барышы і потым вымененую дрэнную карову здаць у каапэратыў і такім чынам атрымаць барыш з двух месц. Сельсавет забараніў яму гэтае рабіць. Але Багдановіч карову ў каапэратыў здаў.

На сходзе сялян, на зададзенае яму прама пытаньне, ці згодзен ён уступіць у калгас, Багдановіч не адказаў, а сказаў, што ён састаяў у калгасе ў мінулыя гады і да сёньняшняга дню там лічыцца (гэты сельсавет быў калектывізаваны амаль на 90 проц., але, у зьвязку з перагібамі, калгасы распаліся).

Відавочна, што гэтым самым жадаў сказаць Багдановіч. Паводзінамі яго абурана ўсё сялянства сельсавету. Калі іншае настаўніцтва сельсавету прымае актыўны ўдзел у правядзеньні пасеўнай кампаніі, калектывізацыі і кантрактацыі, зьяўляючыся застрэльшчыкамі калектывізацыі (напр. т. Крыцкі), дык Багдановіч усімі мерамі ўхіляецца і не жадае прыняць удзелу ў праводзімых зараз на вёсцы кампаніях. Два разы ў вёсцы Рымары, дзе жыве Багдановіч, праводзіўся сход па калектывізацыі, але Багдановіч туды не зьявіўся, будучы па некалькі разоў асабіста папярэджан аб гэтым.

Гарсавету трэба зацікавіцца Багдановічам. Пара вызваліць школы ад такога «настаўніцтва» і калгасы ад такіх «актывістых».

Ф.

Увага збору кары

У сучасны момант павінна разгарнуцца нарыхтоўка кары. Нам дано заданьне на 1931 г. нарыхтаваць івавай кары 1300 тон і яловай — 1180 тон. Гэтая кара павінна пайсьці ў скураную прамысловасьць.

Загатавіцельныя арганізацыі--саюзскур і леспрамгас павінны тэрмінова ўзяцца за гэтую справу, бо тэрмін невялікі і ў той-жа час пляны складаныя. Кожная нарыхтоўчая арганізацыя павінна зараз-жа ўзяцца за справу. З самацёчнымі настроямі трэба весьці бязьлітасную барацьбу.

Сіроцінскі раён у гэтых адносінах кой што зрабіў. Даў кожнаму сельсавету заданьне. Таксама заданьні даны кулацка-заможным гаспадаркам. Нельга не адзначыць брыдкі факт віцебскага леспрамгасу, які ў адносінах нарыхтоўкі яловай кары бязьдзейнічае. Ня гледзячы на тое, што яшчэ ў студзені быў прысланы плян (340 тон), да гэтага часу ня вытварана разьвёрстка па сваіх учлеспрамгасах і гэтае становішча стварае небясьпеку ў выкананьні плянаў.

Загадчык віцлеспрамгасу **Зарэцкі** на гэта адказвае, што бяз пляну яны змогуць больш нарыхтаваць. З такімі «гэроямі» трэба змагацца. Неабходна зараз-жа разгарнуць працу па поўным выкананьні заданьняў.

Буевіч.

ДАГАВОРНАЯ КАМПАНІЯ ПРАХОДЗІЦЬ НЕДАПУШЧАЛЬНА МАРУДНЫМІ ТЭМПАМІ

Да суровай адказнасьці гаспадарнікаў, якія ігнаруюць дырэктывы партыі і ўраду

У ПОЎНАЙ ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ СУСТРЭЦЬ ПЕРАВОД НА НОВЫЯ ФОРМЫ КРЭДЫТАВАНЬНЯ

Да 1-га мая скончыць падрыхтоўку да ўвядзеньня новай сыстэмы крэдытаваньня

Пастанова СНК БССР

Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што:

Падрыхтоўка правядзеньня зьмен у сыстэме крэдытаваньня гаспадарчымі арганізацыямі і аб'яднаньнямі (прамысловасьць, сельская гаспадарка, каапэрацыя) праводзіцца недапушчальна марудным тэмпамі.

Многія гаспадарнікі зусім не ўявілі сабе ўсёй важнасьці гэтай падрыхтоўкі.

а) Апарат дзяржбанку (асабліва яго філіялы) не ўявіў усёй важнасьці гэтай работы і яшчэ ня ўжыў належных канкрэтных захадаў да яе правядзеньня.

б) Дагаворная кампанія яшчэ не разгорнута і гаспадарчыя арганізацыі пакуль што абмяжоўваюцца толькі заключэньнем генэральных дагавораў.

в) Ужываньне гаспадарчага разрахунку ва ўсіх зьвяньнях гаспадаркі і адпаведных гаспадарчых установах да гэтага часу ня выходзіць яшчэ за межы агульных разважаньняў і не атрымала яшчэ канкрэтнага прыстасаваньня па прадпрыемствах.

Адзначаючы памянёнае вышэй, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1) Папярэдзіць кіраўнікоў гаспадарчых арганізацый, што несваечасовае ўжываньне канкрэтных захадаў да правядзеньня гаспадарчага разрахунку пацягне за сабой самую строгую адказнасьць.

2) Для забесьпячэньня пераходу гаспадарчых арганізацый на новыя формы крэдытаваньня, лічыць сваячасовым і мэтазгодным увядзеньне беларускай канторай дзяржбанку па аднагародных разьліках сьпісаньне з рахункаў выключна ў межах свабодных лімітаў.

3) Лічыць, што адным з важнейшых мерапрыемстваў, якое забясьпечвае сваечасовы пераход гаспадарчых устаноў на новую сыстэму крэдытаваньня, зьяўляецца задача ўзмацненьня фінансавых апаратаў гаспадарчых устаноў.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства ВСНГ, Белкаапсаюзу, Народнаму Камісарыяту Забесьпячэньня і кіраўнікам гаспадарчых устаноў вызначыць і паставіць на чале фінансавых апаратаў гаспадарчых арганізацый адказных асоб. Тэрмін выкананьня гэтага даручэньня—3 дні.

4) Даручыць гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам правесьці аналёгічныя мерапрыемствы па пераходзе на новую сыстэму крэдытаваньня па лініі мясцовай гаспадаркі.

5) Папярэдзіць гарадзкія саветы і раённыя выканаўчыя камітэты аб недапушчальнасьці ўмешваньня мясцовых савецкіх органаў у апэрацыйную дзейнасьць філіялаў дзяржбанку.

6) Катэгарычна забараніць усім мясцовым органам мабілізацыю банкаўскіх і фінансавых працаўнікоў на ўсякія гаспадарчыя кампаніі па правядзеньня работы па пераходзе на новую сыстэму крэдытаваньня.

7) Надаючы асабліва важнае значэньне паскоранаму дакумэнтазвароту, прапанаваць упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Пошт і Тэлеграфаў пры СНК БССР тав. Дубіне забясьпечыць выразную і бесьперабойную работу органаў сувязі па прасоўваньні рахункаў фактур і якія накіроўваюцца ў адрас банку і гаспадарчых арганізацый

8) Адзначаючы, што НК Працы да гэтага часу ня выканаў пастановы СНК БССР ад 13-га лютага 1931 году «Пра мерапрыемствы для паляпшэньня практыкі крэдытнай рэформы» (З. З. БССР 1931 г., адзел II, № 4, паст. 52) аб узмацненьні сыстэмы дзяржбанку рахунковымі працаўнікамі і аб звароце ва ўстановы дзяржбанку банкаўскіх спэцыялістаў, якія раней працавалі ў апаратах дзяржбанку — прапанаваць НКП тэрмінова выканаць гэту пастанову, зьвярнуўшы асаблівую увагу на ўзмацненьне раённых філіялаў дзяржбанку.

9) Камісіі выкананьня пры СНК устанавіць сыстэматычны кантроль за правядзеньнем новай сыстэмы крэдытаваньня, даручыўшы ўсім народным камісарам і кіраўнікам гаспадарчых устаноў, ня зьнімаючы адказнасьці з апошніх, у 2-дзённы тэрмін вызначыць адказных асоб, ня ніжэй членаў калегіі, на якіх ускладаецца пэрсанальная адказнасьць за правядзеньне новых форм крэдытаваньня ў падпарадкаваных установах і прадпрыемствах. Прозьвішчы гэтых таварышоў у 2-дзённы тэрмін паведаміць камісіі выкананьня.

10) Усім цэнтральным газэтам максымальна забясьпечыць разгортваньне масавай прапагандысцкай работы па папулярызацыі новых форм крэдытаваньня.

11) Даручыць Дзяржбанку арганізаваць шырокую кансультацыйную дапамогу ўсім гаспадарчым арганізацыям па пытаньнях, зьвязаных з пераводам на новыя формы крэдытаваньня.

12) Папярэдзіць кіраўнікоў усіх арганізацый, што ўся падрыхтоўчая работа па правядзеньні новай сыстэмы крэдытаваньня павінна быць скончана да 1 га мая бяз усякага адтэрмінаваньня.

Старшыня СНК БССР М. Галадзед.
Кіраўнік справаў СНК і ЗКАНА БССР С. Кандыбовіч.
20 красавіка 1931 году г. Менск.

Дабіцца рашучага пералому

Тэрмін заключэньня дагавораў скончыўся 20-га красавіка. Але па прадпрыемствах Віцебску заключэньне дагавораў ідзе вельмі нездавальняюча. Грамадзкая думка вакол гэтага пытаньня не ўзьнята. Ні партыйныя, ні прафсаюзныя арганізацыі не ўдзяляюць дастатковай увагі такой важнай задачы, як уняндрэньне на прадпрыемствах гаспадарчага разьліку. Да гэтага часу ў банк прадстаўлена ўсяго 6 дагавораў, з якіх 2 па цагельнаму заводу № 5, 3—па цюцюнавай фабрыцы і 1—па заводу «Чырвоны мэталіст». Трэба зьвярнуць увагу гаспадарнікаў і яшчэ раз напомніць, што **з 1 га мая прадпрыемствы пойдзе выключна пад дагавор і тыя прадпрыемствы, якія сваечасова не прадстаўляюць у банк заключаныя дагаворы, крэдытавацца ў банку ня змогуць.**

Трэба адзначыць, што з боку гаспадарнікаў маецца тэндэнцыя абярнуць дагаворы ў безадказныя, фармальныя зьдзелкі, і не паказваць пені і няўстойкі за невыкананьне пунктаў дагавору. Між тым, па загаду ВСНГ СССР і Наркамснабу ў дагаворах неабходна паказваць дасканалыя тэрміны выкананьня, агульныя тэрміны адгрузкі, здачу работ, паслуг (месячныя тэрміны, паўмесячныя, альбо дэкадныя). Таксама павінны быць абавязкова дасканалыя тэрміны і спосабы прыёмкі і зазначэньня якасьці прадукцыі. У дагаворах неабходна паказваць у абавязковым парадку няўстойку і пеню за невыкананьне дагавору. Разьмер няўстойкі ня можа быць менш 5 проц. каштоўнасьці не адгружаемай прадукцыі, альбо зданных работ. У гэтым-жа загадзе паказана, што забараняецца ўключаць у генэральныя згоды і дагаворы ўмовы аб аслабаненьні контрагэнтаў ад адказнасьці за пратэрмінаваньне і невыкананьне дагавораў.

З вышэйпаказаных пунктаў загаду ВСНГ СССР відаць, што дагавор зьяўляецца не фармальнай зьдзелкай, а стражайшай адказнасьцю перад сваім кантакарэнтам. Вось чаму гаспадарнікам трэба асабліва ўважліва, выходзячы з умоў гаспадарчага разьліку, заключаць дагаворы. Трэба паказаць тым гаспадарнікам, якія імкнуцца зрабіць дагавор безадказным, што гэта ні да чаго не прывядзе, бо п. 7 гэтага-ж загаду ВСНГ кажа, што пры няўключэньні пені і няўстойкі ва ўмовах дагавораў, ад гэтага не аслабяецца ня выканаўшы дагавор.

Заплочаныя пені і няўстойкі будуць адносіцца ў гаспадарчыя прадпрыемствы на асобы рахунак, каб у кожны час магчыма было судзіць аб якасьці працы дадзенага прадпрыемства.

Гаспадарнікам неабходна зараз-жа ўсю ўвагу зьвярнуць на сваечасовае заключэньне дагавораў, партыйным прафсаюзным, грамадзкім установам неабходна вакол гэтага пытаньня скласьці шырокую грамадзкую думку, каб, асазнаўшы вялікія мэты дагаворнай кампаніі, якія забясьпечваюць рэальнае выкананьне прамфінплянаў, уступіць з 1-га мая на новыя рэйкі працы.

Мельнік.

Скарыстаць вопыт лепшых прадпрыемстваў

На фабрыцы гнутай мэблі ніякіх дагавораў не заключана. Фабрыка ўсё спадзяваецца на прамтрэст, які таксама надзвычайна мала робіць. Рабочыя аб новай крэдытнай рэформе чулі з невялікіх гутарак, але дасканала ня ведаюць аб значэньні гэтай рэформы, не разумеюць значэньне пераводу прадпрыемства на гаспадарчы разьлік. Адміністрацыя фабрыкі не прадпрымае ніякіх мер да пераводу асобных цэхаў на гаспадарчы разьлік таму, што прадпрыемства невялікае, у той час, як вопыт перадавых прадпрыемстваў Савецкага саюзу паказаў, што на гаспадарчы разьлік можна пераводзіць ня толькі асобныя цэхі, але нават і варштаты.

Ляк.

Узмацніць тэмпы

Панчошная ф-ка імя К. Цеткін асноўныя дагаворы на рэалізацыю прадукцыі і па дастаўцы сыравіны ўжо заключыла.

Дагаворы на будаўніцтва яшчэ не заключаны. Грамадзкія арганізацыі ф-кі недааценьваюць гэтага пытаньня. Рабочыя нічога ня ведаюць аб папраўках да новай крэдытнай рэформы.

Сыгналы друку аб тым, што па пераводу цахоў на гаспадарчы разьлік нічога ня робіцца, на ф-цы пачуты і ў апошні час маецца некаторы пералом. Красільна-апрэтурны цэх мае ўжо свой прамфінплян і аддадзен загад аб пераводзе з 1-га мая гэтага цэху на гаспадарчы разьлік.

Грамадзкія арганізацыі павінны зацікавіцца гэтым пытаньнем, дабіцца паскораньня тэмпаў і пераводу на гаспадарчы разьлік усіх цэхаў. **Эпштэйн.**

Зьвесткі аб заключэньні дагавораў па прадпрыемствах гораду на 25 красавіка 1931 г.

З 40 буйнейшых прадпрыемстваў дагаворы заключылі: «Чырвоны мэталіст»—3, цюцюнавая ф-ка—4, цагельны завод № 5—2, камтрэст—1, саюзхлеб—1, нафтатранс—1.

Астатнія прадпрыемствы павінны зараз-жа паведаміць банк аб заключэньні дагавораў.

УЗМАЦНЕНЬНЕМ ТЭМПАЎ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ І РАЗГОРТВАНЬНЕМ НАЦРАБОТЫ

АДКАЗВАЮЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ ВІЦЕБСКУ НА ВЫЛАЗКУ ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНАГА ШАВІНІЗМУ

Чудзіны ня хочуць бачыць вялізарных посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва

Больш актыўна самаачышчаць шэрагі асьветнікаў ад „чудзіншчыны"

Заслухаўшы інфармацыю аб контррэвалюцыйнай вылазцы настаўніка жыткавіцкай школы Чудзіна, агульны сход студэнтаў і настаўнікаў віцебскіх рабфакаў і тэхнікумаў—пэдагагічнага, вэтэрынарнага, электратэхнічнага і сувязі з абурэньнем адказвае на гэтае выступленьне.

Чудзін, выказаўшы контррэвалюцыйныя вялікадзяржаўныя погляды, накіраваныя супроць нацпалітыкі, праводзімай партыяй, паўтараў матывы ўсіх контррэвалюцыянэраў. Чудзіны ня хочуць бачыць вялізарных посьпехаў будаўніцтва, культуры сацыялістычнай па зьместу, нацыянальнай па форме, дасягнутых дзякуючы правільнаму ажыцьцяўленьню ленінскай нацпалітыкі.

Чудзіншчына яскрава сьцьвярджае, што ў ажыцьцяўленьні нацпалітыкі ў БССР вялікадзяржаўны шавінізм зьяўляецца галоўнай небясьпекай. Чудзіншчына, у сувязі з другімі скажэньнямі нацпалітыкі, гаворыць аб тым, што ў асьветніцкіх шэрагах ня ўсё добра. Гэты ганебны факт патрабуе больш актыўнага самаачышчэньня нашых шэрагаў.

За ўзмацненьне тэмпаў ажыцьцяўленьня ленінскай нацпалітыкі!

За больш шпаркую беларусізацыю!

Няхай жыве камуністычная партыя, якая сапраўды ажыцьцяўляе і правільна вырашае нацпытаньне і вядзе нашу краіну да перамогі!

Выкарчаваць з коранем „чудзіншчыну"

Студэнты і выкладчыкі віцебскага рабфаку, пэдагагічна-індустрыяльна і электратэхнічнага інстытутаў кваліфікавалі выступленьне Чудзіна, як контррэвалюцыйнае выступленьне, якое льле ваду на млын нацдэмакратаў і шавіністых усіх колераў, таксама і нацфашыстых у Заходняй Беларусі. На выступленьне Чудзіна студэнцтва адказвае яшчэ большым узмацненьнем беларусізацыі і інтэрнацыянальнага выхаваньня, шырэйшым разгортваньнем крытыкі і самакрытыкі, якая дапаможа выкрыць рэшткі чудзіншчыны.

Студэнты абвясьцілі дэкаду штурму па вывучэньні нацпытаньня і ўзмацненьні беларусізацыі.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Барацьбе за прамфінплян і калгаснае будаўніцтва

ПАВІННА БЫЦЬ ПАДПАРАДКАВАНА РАБОТА ПА САМАПРАВЕРЦЫ ВІЦЕБСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

За грунтоўную перабудову ўсёй партработы, каб пасьпяховей выконваць задачы 3-га рашаючага году пяцігодкі

За масавы агляд і перабудову партработы

Мы паведамлялі, што ў Віцебск прыехала інструктарская брыгада ЦК КП(б)Б для правядзеньня генэральнага аглядупсамаправеркі ўсёй работы віцебскай партарганізацыі. Гэта будзе ня проста інструктаж ці рэвізыйна-дасьледчая работа.

Паводле пляну работы ЦК, брыгада павінна будзе дапамагчы гарадзкой партарганізацыі грунтоўна вывучыць формы і мэтады партработы і на падставе гэтага вывучэньня тут-жа перабудаваць яе ў адпаведнасьці з тымі тэмпамі і задачамі, якія стаяць перад партыяй у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

У самаправерку работы арганізацыі павінна быць уцягнута ўся пралетарская грамадзкасьць Віцебску. Гарком партыі ў дапамогу 5-ці таварышом з брыгады ЦК ужо вылучыў **75 таварышоў** з актыву, разьбіўшы іх на **18 брыгад**, па паасобных вучастках работы. Апрача таго гарком камсамолу і рабкорыя Віцебшчыны павінны будуць вылучыць некалькі брыгад, якія таксама будуць работаць пад кіраўніцтвам прымацаваных да таго ці іншага вучастку работы таварышоў з брыгады ЦК. Плюс к гэтаму на кожным прадпрыемстве пры бюро ячэек і парткалектываў таксама будуць арганізаваны брыгады з партыйцаў, камсамольцаў і рабкораў, якія будуць дапамагаць брыгадам гаркому больш дэталёва абсьледваць партработу свайго прадпрыемства.

23-га красавіка на арганізацыйнай нарадзе ўдзельнікаў самаправеркі кіраўнік брыгады ЦК т. **Лісковіч**, падрабязна асьвятліўшы задачы і плян работы гэтага агляду-самаправеркі, асабліва падкрэсьліў важнасьць масавага ўдзелу партыйцаў у гэтай рабоце, якая ня толькі дасьць магчымасьць праверыць і перабудаваць партработу, але і на справе навучыць актыў як трэба правяраць сваю работу. Апрача таго, гэта работа дапаможа выявіць той актыў, які ЦК будзе скарыстоўваць і ў далейшым у якасьці па-заштатных інструктараў.

— Асноўныя пытаньні—кажа т. Лісковіч—вакол якіх мы будзем разгортваць усю работу—гэта **барацьба за прамфінплян і калгаснае будаўніцтва. Гэтым сьцяжнёвым пытаньнем павінна быць падпарадкавана ўся работа па самаправерцы і перабудове партработы.** Уся работа па абсьледваньні будзе праходзіць не па тэрытарыяльнай адзнацы, а па праблемах нашага будаўніцтва. Аб'ектам-жа абсьледваньня будуць ячэйка, **дырэкцыя, фабком, калгас і сельсавет.**

Работа брыгад будзе разьбіта па пяці групах і кожная з гэтых груп, пад кіраўніцтвам інструктара ЦК будзе работаць па вывучэньні цэлага рада пытаньняў, як-та: гаспадарчыя, масавы-бытавыя, вясковыя пытаньні, а таксама пытаньні партбудаўніцтва і праверкі выкананьня.

Прадстаўць вялічэзная палітычна важная работа, якую без прыцягненьня мас к актыўнаму ўдзелу ў гэтай справе выканаць зусім немагчыма. Апрача таго нельга забываць аб тым, што на гэту работу мы можам адвесьці вельмі нязначны час, а таму ўсе парт'ячэйкі і калектывы гораду зараз-жа павінны мабілізаваць увагу мас вакол гэтай генэральнай самаправеркі.

У нас шмат было розных абсьледваньняў, але яны амаль ніколі не дасягалі сваёй асноўнай мэты—гэта грунтоўнай перабудовы. Гэту-ж самаправерку неабходна давесьці да канца і на падставе яе перабудаваць работу партыйнага кіраўніцтва так, каб ня толькі выканаць, але і перавыканаць усе заданьні пяцігадовага пляну трэцяга рашаючага году.

Н. Баруноў.

Для Міхайлава партыйныя дырэктывы не прынцыповыя пытаньні

Парт'ячэйкі, згодна пастановы ЦКК, прыступілі к правядзеньню важнейшай палітычнай задачы — праверкі выкананьня пастаноў камісій па чыстцы партыі.

Гэтая работа праводзіцца, як і раней, пры чыстцы, з удзелам шырокіх беспартыйных працоўных мас. Гэтая праверка мае аграмаднае палітычнае значэньне і лішняе гаварыць аб тым, што кожны партыец у паасобку і ўся ячэйка ў цэлым павінны весьці растлумачальную работу па пытаньні праверкі з тым, каб забясьпечыць удзел беспартыйных, шырока разгарнуўшы бальшавіцкую крытыку і самакрытыку вакол праверкі выкананьня пастаноў, вынесеных у час чысткі.

Зусім інакш усе гэтыя задачы разумее старшыня праўленьня арцелі інвалідаў імя «25-га Кастрычніка», член партыі т. **Міхайлаў**. На пытаньне—чаму на сход не зьявіліся беспартыйныя, Міхайлаў адказаў: „гэтае пытаньне для членаў арцелі ня прынцыповае, яны (члены арцелі) ідуць толькі на сход па прынцыповых, іх датыкаючыхся непасрэдна, пытаньнях". Калі я імкнуўся даказаць, што доўг кожнага члена партыі растлумачыць, што гэтае пытаньне зьяўляецца прынцыповым, Міхайлаў з няскрываемай злабой крыкнуў: „ідзі і растлумачвай". Упасьледку высьветлілася, што Міхайлаў ня толькі паставіў пытаньне ў антыпартыйным парадку, але і ганебна, недапушчальна, узьвёў паклёп на членаў арцелі, як быццам няпрызнаньні імі партыйных пытаньняў для сябе прынцыповымі, бо пры чыстцы партыі члены арцелі ўдзельнічалі амаль што на 100 проц. А ў гэты раз яны зусім ня былі пастаўлены ў вядомасьць аб прадстаячым сходзе.

Характэрна, што нават члены партыі, зьявіўшыяся на сход, ня ведалі, якое пытаньне стаіць на абвестцы дню, ня гледзячы на тое, што сэкратару партячэйцы было перададзена прадстаўніком РСІ за некалькі дзён раней аб неабходнасьці скліку сходу і шырокага растлумачэньня аб прадстаячай праверцы.

Такія адносіны з боку Міхайлава зьяўляюцца самым ад'яўленым фактам правага апартунізму, якое павінна быць асуджана самым рашучым чынам парт'ячэйкай. Трэба прыцягнуць яго да партыйнай адказнасьці.

Жыцельзэйф.

Ці можа ён правяраць работу арганізацыі?

На фэцы Лёкерта абіралі камісію па праверцы тых пастаноў, якія вынесла парттройка пры чыстцы ячэйкі. У гэтую камісію трапіў і т. Рагайжыс. Нам думаецца, што т. Рагайжыс ня можа быць у гэтай камісіі бо маецца шмат выпадкаў, калі ён, уносячы прапановы, як член бюро калектыву і член цэхавой ячэйкі, ня выконваў іх (гэта было і з звальненьнем з работы старшага майстра Воўкава за кражу і з Арловым).

Маюцца таксама выпадкі і зажыму самакрытыкі з боку т. Рагайжыса. Так, калі актыўны рабкор т. Гутковіч атрымаў выгавар, дык Рагайжыс у сваім выступленьні сказаў, што «ты атрымаў гэта за свой язык». Сьледам за Рагайжысам ідуць і некаторыя рабочыя з цэху, на чале якога стаіць Рагайжыс. Так, калі абіралі старшыню цэхкамітэту т. Зайцава, апошні адмаўляўся, кажучы, што майстры крыўдзяцца, калі ім пакажаш на тую ці іншую памылку.

І. К.

Спынеце зьдзекі над старым партыйцам

Ужо доўгі час, як у праўленьні ЦРК працуе ў галіне распаўсюджваньня друку і каапэрацыйнай літаратуры член партыі т. **Глазман**. Калі ён скончыў даручаную яму працу, праўленьне замест таго, каб даць т. Глазману адпаведную работу, дык яно не знайшло нічога падыходзячага, як паставіць т. Глазмана камэндантам будынку ЦРК, у той час, як т. Глазман па свайму ўзросту да гэтай работы не падыходзіць. Тав. Глазман—стары член партыі і ў часы царызму прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыйнай барацьбе пралетарыяту, займаўся распаўсюджваньнем нелегальнай літаратуры і г. д.

Ці няма тут зьдзекаў над старым членам партыі, які вось ужо два месяцы, як абівае парогі праўленцаў і ня можа дабіцца прамога адказу аб сваёй далейшай рабоце?

Н.

Выкрыць твар кар'ерыста і афэрыста „партыйца" Смольскага

Год назад пастановай парт'ячэйкі б. акрфа за склочніцтва, кар'ерызм і рвацтва—партыец Смольскі быў зьняты з пасады загадчыка 3-м аддзяленьнем ашчадкасы, атрымаўшы суровы выгавар з папярэджаньнем. Маючы за сьпіной гэты багаж, Смольскі прышоў на работу на МББ чыг. для перакваліфікацыі, быў на курсах электра-варнікаў, а зараз працуе зваршчыкам.

Якія вывады зрабіў Смольскі з свайго мінулага, як ён выправіў свае памылкі?

У сувязі з адсутнасьцю брыгадзіра зварачнага цэху, Смольскі апынуўся на гэтай пасадзе і адразу-ж праявіў сябе як антысэміт. У цэху працуюць два зваршчыкі-яўрэі, і Смольскі стварыў для іх такія цяжкія ўмовы работы, што адзін з іх т. Р. ледзь ня ўжыў спосаб самагубства. Меўся такі выпадак, што гэты таварыш варыў чыгунны рухавік вагай больш тоны і яму ў гэтай цяжкой рабоце ня толькі ніхто не дапамог, а нават асобныя рабочыя, у тым ліку Смольскі, кпілі з яго. Апошні, сьмяючыся і хлопаючы яго па плячу, казаў: «ці моцна?» У выніку рухавік, бадай, угробілі. Калі другі рабочы яўрэй папрасіў Смольскага дапамагчы паставіць на стол дышла, апошні кінуў: «сам цягні».

Смольскі ўжывае ўсе спосабы, каб зрабіць сабе кар'еру, выстаўляючы сябе наперад, ужываючы розныя меры з тым, каб сваю віну ў рабоце перакласьці на другога і тым выгадзіць сябе. Так, калі да паравоза № 71/1 была прыхвачана няверна сьпіца, у чым вінават Смольскі, ён усю віну зваліў на другога таварыша, які ня меў ніякага дачыненьня да гэтай прыхваткі. Смольскі нейкім чынам дабіўся того, што яго прэміравалі за эканомію кісларoду і за вынаходзтва варкі медных падшыпнікаў электрыцтвам, чаму значна дапамог у гэтым Смольскаму быўшы заг. рэмонтам Поль.

Афэрыст Смольскі, ня ведаючы газавае зварки, сумеў акалпачыць адміністрацыю, яна паверыла яму і габінэтным парадкам пастанавіла прэміраваць. Медныя падшыпнікі вараць электрыцтвам на ўсіх заводах, Смольскі спэцыяльна вучыўся на гэта, на яго патрачана бадай 2 тыс. рублёў—і на якой падставе выдана яму прэмія за варку, ніхто ня ведае, апрача Смольскага і тых, хто яму прызначаў гэтую прэмію. Усе гэтыя прадзелкі Смольскага выявіліся і бюро ячэйкі № 1 вынесла Смольскаму выгавар. Але Смольскі даходзіць да таго, што ставіць перад бюро ячэйкі ўльтыматум, што «калі дадуць выгавар, дык няхай выключаюць з партыі» і ў гэты самы дзень, прышоўшы к сэкратару ячэйкі, аддае яму партбілет, але напэўна перадумаў і зноў забраў увечары. Праз некалькі часу Смольскі пускае чуткі, што ён нібы нашоў спосаб зрэзкі галовак заклёпак электрадугой. Толькі ўжо тут Смольскаму не пашчасьціла, бо гэтая вынаходка была відома ўсім рабочым. Пасьля гэтай няўдачы Смольскі расчароўваецца ў лініі партыі. «Партыя,—кажа Смольскі,—зайшла ў тупік, няма хлеба», а таму ён зноў падае заяву аб выхадзе з партыі. Смольскі пачынае весьці ўсякія разважаньні, шкодныя партыі і даходзіць да таго, што беспартыйны абараняе перад Смольскім лінію партыі. Праз некалькі часу Смольскі заяўляе тэхнічнай сэкцыі, што ён зможа падняць агульную адукацыю рабочых праз курсы. Цікава як Смольскі, ня ведаючы электратэхнікі, тэхналёгіі мэталю, тэорыі пабудовы зваркі швоў і інш., будзе падымаць тэхнічны ўзровень рабочых. Чым тлумачыць такі посьпех дзейнасьці Смольскага? Водле нашае думкі—тым, што ён вельмі ўслужліў да начальства, асабліва да начальніка майстэрні тав. **Фока**, якога Смольскі лісьліва называе «дзядзя Вася». Такое падхалімства з боку Смольскага ня толькі ў дачыненьні начальніка майстэрні, а і наогул. Партарганізацыі трэба зацікавіцца Смольскім і выкрыць яго твар.

Ф. Б.

Ці ёсьць адводы

Ячэйкамі КП(б)Б прыняты ў кандыдаты партыі наступныя тав.: Шурынаў Д. В. (старасельская яч.), Когаль А. А., Раяк Е., Стэрнін А., Корзін А., Фэльдмарк Д. («Чырвоны мэталіст»), Гарэлік, Шубік, Пучко, Сакалоўскі, Селязьнёў, Шур, Левіт, Скабцоў, Дудо, Шульместар, Баранаў, Рутэнберг («Сьцяг індустрыялізацыі»).

Пераведзены з кандыдатаў у сапраўдныя члены партыі: тав. Хавін, Гонікман С., Фукс, Марышэў, Шэнкін («Сьцяг індустрыялізацыі»), Васільлеў (ф. «Прагрэс»), Шульман Л., Цынман С. (Чырвоны мэталіст»).

Просьба да ўсіх таварышоў, маючых матывіровачныя адводы на таварышоў, уступаючых у кандыдаты партыі і пераводзячыхся з кандыдатаў у члены партыі, заявіць аб гэтым у трохдзённы тэрмін у гарком партыі (Замкавая, 26).

БАЯВОЙ ПРАВЕРКАЙ УДЗЕЛУ РАБСЕЛЬКОРЫІ

у ажыцьцяўленьні палітычна-гаспадарчых задач спаткаем надыходзячы дзень друку

РАШЭНЬНІ УСЕСАЮЗНАЙ НАРАДЫ ПА РАБСЕЛЬКОРАЎСКІХ ПЫТАНЬНЯХ—У МАСЫ!

За новую хвалю ўдарніцтва

Партыя паставіла вялічэзныя задачы перад нізавым друкам і рабселькорамі быць арганізатарамі мас на барацьбу за прамфінплян, за калгаснае будаўніцтва, за адзіную ленінскую нацыянальную палітыку. Прыводзімыя сёньня факты яскрава сьведчаць аб тым, што некаторыя гаспадарнікі, партыйныя ячэйкі і фабзаўкомы ня ўлічваюць значэньне нізавога друку, як змагацца ў разгортваньні крытыкі і самакрытыкі. Факты агідных цкаваньняў рабкораў, нават з боку рэдкалегій і фабзаўкомаў кажуць аб тым, што партыйныя арганізацыі паасобных прадпрыемстваў ня сталі на чале нізавога друку, ня здолелі стварыць адпаведныя ўмовы для шырокага разгортваньня крытыкі і самакрытыкі.

Гэтым агідным зьявішчам павінен быць пакладзен канец. Партыйныя арганізацыі павінны неадкладна стаць на чале нізавога друку і рабселькораўскага руху, жорстка ўдарыць па тых, хто цкуе рабкораў і душыць пралетарскую самакрытыку. Праводзімы агляд самаправерка нізавога друку павінен менавіта прайсьці пад лёзунгам зьнішчэньня ўсіх гэтых брыдкасьцяй, пад лёзунгам узмацненьня ролі друку і рабселькораўскага руху, як арганізатараў мас.

Набліжаецца 5 мая—дзень пралетарскага друку. Гэта абавязвае кожную партыйную арганізацыю, рэдкалегію і фабзаўмясцком яшчэ шырэй разгарнуць растлумачальную работу аб значэньні нізавога друку і рабселькора-ўдарніка, узьняць новую моцную хвалю ўдарніцтва ў друку. Кожная партыйная арганізацыя і рэдкалегія павінны падвесьці вынікі, насколькі газэта была здольна змагацца і выконваць пастаўленыя перад ёю задачы.

Партыйныя калектывы і ячэйкі ў выкананьне пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б павінны безадкладна прыступіць **да перавыбараў рэдкалегій нізавых газэт**, праводзячы гэтакія пад кутом погляду яшчэ большага ўзмацненьня рэдкалегій і забясьпячэньня складу іх найбольш вытрыманымі партыйцамі і рабселькорамі-ўдарнікамі, праявіўшымі сябе на вытворчасьці.

Рыхтуючыся да дня друку і ўсебеларускага рабселькораўскага зьезду, рабселькоры Віцебшчыны павінны падыйсьці да яго моцнымі калёнамі ўдарных рабселькораўскіх брыгад з вызначанымі перамогамі і дасягненьнямі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Пачаць папулярызацыю пастаноў усесаюзнай рабселькораўскай нарады

Падрыхтавацца да дню друку

ЦСПСБ прапанаваў усім фабзаўкомам і ЦП саюзаў уключыцца ў праверку работы насьценгазэт на прадпрыемствах, пачаць папулярызацыю пастаноў усесаюзнай рабселькораўскай нарады і падрыхтоўкі да ўсебеларускага рабселькораўскага зьезду. На прадпрыемствах у момант абедзеных перапынкаў будуць праводзіцца гутаркі. Фабзаўмясцкомам прапанавана ўстанавіць рэгулярны выпуск насьценгазэт, пашырыць сетку насьценгазэт у кожным цэху, у саўгасах і калгасах. Уся кампанія пройдзе пад лёзунгам—«кожны ўдарнік рабселькор, кожны рабселькор—ударнік».

Да дня друку 5-га мая намечана арганізаваць выстаўкі насьценгазэт, шматтыражак. У момант сьвяткаваньня дня друку на прадпрыемствах будзе праведзена кампанія па вярбоўцы новых падпішчыкаў на газэты «Правда», Зьвязда», „Рабселькор", газэты нацменшасьцяй. Будзе ўзмоцнена сувязь з рабкораўскімі арганізацыямі за мяжой.

Рабкоры Віцебскага чыгуначнага вузла да дню 1-га мая і дню друку

Рабкоры газэты «Молат» к 1-му мая і дню друку арганізавалі 10 ударных паравозаў, замацавалі брыгады за паравозамі, даўшы 60 лепшых ударнікаў-рабкораў. Ударнымі зьяўляюцца наступныя паравозы: імя газэты „Правда" С-74, імя газэты «Зьвязда» С-53, імя «Камсамольскай Праўды» Э-44, імя газэты «Молат» С-13, імя газэты „Гудок" Э-43, імя «Віцебскага Пралетарыя» С-27, імя «Чырвонай Зьмены" Щ-432, імя «Ударніка рабкора Чэпіна» С-6, імя „518 і 1040" С-21, „За гасразьлік" С-56.

Брыгады ўсіх гэтых паравозаў у поўным складзе працавалі не пакладаючы рук па рамонту сваіх паравозаў і прывялі іх у добрае становішча. Гэтыя паравозы ўносяць новыя пункты ў дагаворы сацспаборніцтва. Ад прамыўкі да прамыўкі паравоз ня зойдзе ў дэпо. Найбольшы прабег кілёмэтраў, дробны рамонт выконваць сваімі сіламі, каб зьменшыць расход сродкаў на рамонт, эканомія апалу, перарасход на гаспадарчы разьлік, ніводнай хвіліны спазьненьняў. Сыстэматычна сыгналізаваць у газэту „Молат" аб перашкодах у працы, аб дасягненьнях і недахопах.

Брыгады, якія носяць ганаровую назву газэт, будуць падтрымліваць сувязь з газэтамі, як ударныя рабкораўскія пасты. У лік брыгад увайшлі лепшыя таварышы. Па гэтых паравозах павінны раўняцца ўсе астатнія.

Новікаў.

Да ўсебеларускага зьезду даць 1500 экзэмпляраў „Рабселькора"

Задачу прасоўваньня ў масы газэты «Рабселькор» некаторыя рэдкалегіі шматтыражак і насьценгазэт не даацелілі. 353 экз. тыражу газэты распаўсюджаны сярод рабкораў гор. Віцебску—больш чым недастатковая лічба. Адзінкі экзэмпляраў на буйных прадпрыемствах, як панчошная фабрыка (7 экз.), «Дзьвіна», швэйная—«Прафінтэрн», акулярная і інш. з усёй яскравасьцю сьведчаць аб адсутнасьці якой бы то ні было работы ў напрамку прасоўваньня «Рабселькора» ў рабкораўскія шэрагі.

У чэрвені склікаецца ўсебеларускі зьезд рабселькораў. Да зьезду разгортваецца шырокая справаздачна-перавыбарчая кампанія нізавога друку. Гэтыя пытаньні на старонках «Рабселькора» атрымаюць шырокае асьвятленьне бальшавіцкага кіраўніцтва адказнай работай праверкі і падвядзеньня вынікаў рабселькораўскага руху на Беларусі і таму, менавіта, кожная рэдкалегія неадкладна павінна шырока разгарнуць працу па прасоўваньні «Рабселькора» у рабселькораўскія масы.

Да ўсебеларускага зьезду рабкоры Віцебску павінны даць 1500 новых падпісчыкаў «Рабселькора».

Д. Б.

Ульман — зажымшчык самакрытыкі

Інструктар ватнага цэху фабрыкі «Прафінтэрн» **Ульман** ня любіць самакрытыку. Так, калі Ульман даведалася, што адна з работніц выказала сваю думку, што іншыя інструктары, як **Песміна і Русіна** больш могуць наладзіць работу і лепш кіруюць цэхам, яна стала сачыць за гэтай работніцай вышукваючы да яе прыдзіркі. І калі выпадкова гэтая работніца прапусьціла брак папярэдня апэрацыі, дык Ульман накінулася на яе з крыкам: «Ты можаш толькі трапаць языком, а працаваць ня ўмееш».

Ульман—член партыі і бюро ячэйкі павінна зрабіць у адносінах яе свае вывады.

Барыкадаў.

Пералому ў рабоце яшчэ няма

Нядаўна была распушчана за бязьдзейнасьць рэдкалегія газэты «Чырвоная акулярніца». Створаная новая рэдакцыйная тройка не зрабіла яшчэ належнага пералому ў працы газэты. На фабрыцы маецца шмат выпадкаў шавінізму і антысэмітызму. Амаль зусім не праводзіцца беларусізацыя, а створаны гурток белмовы работы не наведваецца.

Між тым рэдтройка ня лічыць неабходным скласьці вакол гэтага адпаведную грамадзкую думку. Заметкі, перацаваемыя ў рэдтройку, зьмяшчаюцца праз два месяцы, ці зусім не зьмяшчаюцца. Трэба выправіць недахопы ў працы рэдтройкі.

А—і.

Рэдкалегія ФЗВ на чале заціску самакрытыкі

Аб тым, што крытыка і самакрытыка у ФЗВ краўцоў **дастаткова** не разгорнута, яскрава сьведчаць тыя факты і хваробныя зьявішчы, якія сталі звычайнымі ў ФЗВ. Больш як паўгода не выконваецца прамфінплян, адміністрацыя цкуе рабкораў. Так, рабкора **Шэйнкіна**, за яго заметкі аб дарэмных камандыроўках адміністрацыі, пачынаюць перакідваць з вучастку на вучастак, і калі ён зьвярнуўся да загадчыка вытворчай часткі **Рывіна** і прасіў растлумачыць яму прычыну перакідкі, дык апошні адмовіўся.

За год у ФЗВ было 28 выпадкаў антысэмітызму і шавінізму. Безгаспадарчасьць, крадзёж, яўнае разлажэньне вучняў, п'янка, карты, падхалімства і самазабесьпячэньне і ўсё гэта з-за таго, што кіраўніцтва ФЗВ ня здольна разгортваць крытыку і самакрытыку. **Старшыня рэдкалегіі Усыскіна спрыяе заціску самакрытыкі.** Пад яе кіраўніцтвам у саўгасе «Ходцы» 20 вучняў дэманстравалі цыйна кінулі работу і ўшлі дамой, але **Усыскіна**, якая ў гэтым была вінавата, сваёй памылкі не прызнала. Нягледзячы на гэта, Усыскіна вылучаецца старшынёй эканомсэкстару, дзе яна таксама праваліла работу.

Пасьля таго, як Усыскіна праз «Віц. Пралетары» і газэту «Сьцяг індустрыялізацыі» была разаблачона, яе вывелі са складу рэдкалегіі, але, не згадзіўшыся з гэтым, яна арганізавала вакол сябе вядомых зажымшчыкаў самакрытыкі, выкрытых насьценгазэтай, як **Шнейдэйс і Мольцын**. З дапамогай адміністрацыі, якая недалюблівае самакрытыку, Усыскіна зноў становіцца старшынёй рэдкалегіі, а актыўны рабкор **Кагам** зусім у склад рэдкалегіі ня ўводзіцца.

Калі ад вучня Спрынцсона паступіла ў рэдкалегію заметка, бічуючая нядбайнасьць адміністрацыі, дык Усыскіна пашла з ёю да адміністратара і вядомага зажымшчыка самакрытыкі Рывіна наб параіцца з ім, і калі ён казаў «не прапусьціць», дык Усыскіна паслухала яго і заметку не прапусьціла. Наадварот, калі паступае хлусьлівы матар'ял на актыўных рабкораў, дык яна яго без усякай затрымкі прапускае ў газэту.

Работы з рабкорамі ў ФЗВ ніякай не вядзецца і рабкораўскія брыгады распаліся. Газэта не адбівае сучаснасьці, не змагаецца за прамфінплян, рэагаваньня на заметкі няма і рэдкалегія нічога ў гэтым напрамку ня робіць. Усыскіна нядбайна адносіцца да рабкораўскіх заметак; аднойчы яна згубіла 3 каштоўных заметкі. Усыскіна разаблачае псэўдонімы рабкораў. Так яна сказала Рывіну псэўдонім аднаго рабочага, а Рывін гэта расказаў настаўнікам. Акрамя таго Усыскіна падхалімнічае перад адміністрацыяй. Яскрава, што пры такім складзе рэдкалегіі здаровая крытыка нямысьліма. Усыскіна ніколі не аб'яўляе членам рэдкалегіі аб днёх паседжаньня апошняй.

Партыйны камітэт «Сьцяга індустрыялізацыі» павінен тэрмінова ўмяшацца ў гэтую справу. Неабходна тэрмінова пераабрацъ рэдкалегію, якая стаіць на чале заціску самакрытыкі. Пракуратура павінна зрабіць свае вынікі ў адносінах да тых, хто заціскае пралетарскую самакрытыку.

Рабкораўская брыгада: Ляк, Глазман, Кагам, Пазьнякоў, Рутэнбэрг і Кабанаў.

„Як ты сьмееш мяне крытыкаваць"

На адбыўшымся сходзе ў школе 3-й швэйнай фабрыкі ў спрэчках па дакладу загадчыцы школы **Баранавай** выступіла прыбіральшчыца **Шмурава**, якая падкрэсьліла шэраг дэфэктаў у рабоце Баранавай. Пасьля сканчэньня сходу апошняя падышла да **Шмуравай** і раззлаваная, казала ёй: **„Як ты адважылася мяне крытыкаваць. Я ведаю, хто ты і табе пакажу"**.

Гэтая нахабная форма заціску самакрытыкі павінна атрымаць належны адпор. Слова аб Баранавай павінна сказаць партыйная ячэйка 3-й швэйнай фабрыкі.

Вока.

У камтрэсьце за работу ня браліся

У камтрэсьце заклік т. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай не знайшоў ніякага адбітку ў рабоце гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый. Ня гледзячы на тое, што на калгаравору арганізацыя павінна арганізаваць кароткатэрміновыя курсы для высокавольтных манцёраў, а гэта надзвычайна неабходна для ўзьняцьця іх кваліфікацыі, а таксама стварэньня гурткоў для вагонаважатых трамваю па вывучэньні тэхнікі трамваю, але нічога ў гэтым напрамку ня робіцца. Інжынэрна-тэхнічная сэкцыя трэсту бязьдзейнічае. Час ужо ўзяцца за работу.

Дворкін.

Павялічыць тыраж „Піанэра Беларусі"

Падпіска на дзіцячую газэту «Піанэр Беларусі» знаходзіцца зусім у заняпадзе. Дадзены для Віцебску плян у 3 тысячы экзэмпляраў ня выконваецца. Маецца-ж у горадзе ня больш 1500 экз.

Неабходна кожнаму рабкору, селькору і студкору, а асабліва дзеткору, зараз-жа павесьці растлумачальную працу сярод рабочых і вучняў за выкананьне кантрольных лічбаў падпіскі на «Піанэр Беларусі».

Барэнбаум, Шмідт.

Прыняць тэрміновыя меры

Вельмі дрэнна працуе насьценгазэта **„На рэйках"** разьезда Чэпіна МББ чыгункі. На працягу 4-х месяцаў ня было выпушчана ніводнага нумару газэты. Мясцком № 5 зусім ня цікавіцца газэтай і не жадае наладзіць працу па яе своечасоваму выпуску. Газэта не адбівае сучаснасьці.

Трэба прыняць тэрміновыя меры і пакласьці канец апартуністычнай сьпячцы мясцкому.

Драмучы.

Гэрої з лягеру зажымшчыкаў

Каб адпомсьціць за крытыку, «пакрыўджаныя» становяцца амаль выходцамі, шукаючы розныя формы і мэтады цкаваньня і заціску самакрытыкі. Карыстаючыся сваім становішчам, некаторыя гаспадарнікі пад розкымі прычынамі звальняюць рабкораў, перакідваюць іх з больш аплачваемай работы на ніжэйшую, выносяць вымовы. Усё гэта ня нова і ня раз ужо праз друк пацьвярджалася фактамі.

Справа аб цкаваньні тав. **Краўле** выключна характэрна тым, што на чале заціску і цкаваньня стаў старшыня рэдкалегіі інструмэнтальна-мэблёвай фабрыкі **Шлафер**, які, карыстаючыся сваім становішчам, выбраў насьценгазэту для зьвядзеньня асабістых рахункаў з **Краўле**. У свой час Краўле меў поўнае падтрыманьне з боку рэдкалегіі, яго матарыялы зьмяшчаліся ў насьценгазэце, але гэта было да таго часу, покі ў паступіўшай ад Краўле заметцы ён не закрануў **Шлафера**. Ён паказаў у ёй, што Шлафэр і старшыня фабкому **Прыхадоўскі**, па яго думцы, ня могуць быць абраны ў новы склад фабкому. Адводы і крытыка пацьвярджаліся фактамі.

Гэты важкі матарыял быў рэдактарам скарыстаны роўна праз два месяцы пасьля перавыбараў фабкому, прычым трэба аддаць справядлівасьць яго мастацтву рэдагаваць матарыял. Апошні быў скарочан прыблізна на 75 проц. і зьявілася новая ўстаўка з некалькіх слоў, якія характарызавалі Краўле, як антысэміта. Шлафэр робіць прыпіску ад імя рэдкалегіі, дзе паказвае, што «заметка Краўле прасякнута зьмяніным антысэміцкім шыпеньнем, дзікай сплёткай, веючай бясьсільнай злабой і г. д.», а адсюль ён робіць вынік, што яму ня месца ў рабочым асяродку.

